# Мент

***Сяргей Дубавец***

У Краіне Саветаў усё было наадварот. Праўда лічылася паклёпам, пакупнікі існавалі для крамаў, а войска змагалася за мір. У прыватнасьці, паліцыю (г.зн. гарадзкую службу, ад грэцкага *„поліс“* — места) тут называлі міліцыяй (г.зн. ваеннай, мілітарнай службай), але пры гэтым міліцыянт мусіў увасабляць у вачах народу міралюбства і гуманізм, а паліцыянт асацыяваўся з фашыстоўскімі захопнікамі і капіталістычным бясправуем.

Бадай, найбольш міралюбства міліцыі спаміж іншых рэспублік-сясьцёр культывавалася ў БССР. Памятаю, яшчэ зь дзяцінства душа не прымала пачутага ў гутарках з раўналеткамі блатняцкага слова *„мент“* — выразу пагарды да ахоўнікаў парадку. Як можна было пагарджаць гэтымі дабрадушнымі дзядзямі Сьцёпамі, якія пераводзяць бабульку цераз вуліцу, а да таго ж адважна змагаюцца са злодзеямі? У каго спытаць, як прайсьці да патрэбнага месца, параіцца або нават і проста папытацца часу? Найзручней у міліцыянта. Словам, народ міліцыю паважаў, *„мянтамі“* яе не называў, масава чытаў міліцэйскую газэту „На страже Октября“, пра што сьведчыў яе тагачасны наклад, і не хадзіў на чырвонае сьвятло, чым зьдзіўляў сваіх суседзяў у былым СССР. У першыя перастроечныя гады тагачасныя нефармалы любілі паўтараць, што міліцыя — з намі, бо гэта нашы, беларускія, вясковыя пераважна хлопцы. Напэўна, так яно й было.

Але вось настаў кастрычнік 88-га году. Дзяды. Масавы мітынг на Маскоўскіх могілках у Менску. На сумленьні тагачаснага міністра МУС Віктара Піскарова першы развод народу зь міліцыяй, першыя сутычкі, вадамёты і сьлезацечны газ. Гэта тады да групы дэманстрантаў, загнаных дубінкамі ў поле, падбег запыханы юнак і пракрычаў слова трывогі — *мянты*! З таго часу экзатычнае блатняцкае слова, якое раней азначала ўсяго толькі дасьведчанасьць распавядальніка ў тэрміналёгіі крымінальнікаў, увайшло ў беларускую мову як паўнапраўная і часта ўжывальная лексэма. *Мент* стаў пэрсанажам нашага жыцьця.

А пасьля быў Лукашэнка, які разбўхаў міліцэйскія штаты да нічым не апраўданых памераў, што прывяло да дыскваліфікацыі ахоўнікаў парадку. Пасьля былі разгоны мірных дэманстрацыяў, пабоішчы і арышты на вуліцы проста за беларускую мову або — за карыя вочы. І вось ужо сёньня нікога ня зьдзівіць выгляд міліцыянта, які ўтаропіўся ў вакно трамвая, калі побач тэрарызуе публіку п’яны бамбіза. Я бачыў, як два патрульныя ў Менску прасьледавалі міма чалавека, што ня мог падняцца зь зямлі. Але каб міліцыянт пераводзіў цераз вуліцу бабульку, я ня бачыў даўно. І спытацца ў міліцыянта, каторая гадзіна, не прыходзіць у галаву. Затое, калі мы з калегам гаворым на тралейбусным прыпынку, а міма праходзіць міліцэйскі нарад, для мяне стала зусім натуральным напаўголаса папярэдзіць сябра: асьцярожна, *мянты*!

# Мех

***Рыгор Барадулін***

Хоць прымаўка мімаходзь зазначае: *„Век жыць — ня мех шыць“*, але і мех шыць, каб ні зярнятка не прапаролася вострым носікам, ні цяжкое пакладзіва не прарвала яго, — трэба ўмець.